1

Быў сабе круль з крулевай і мелі адну дачку´ вельмі харошую. После ў караля жонка ўмерла і ён ажаніўся з другою, харошчаю,[1] як была першая; але дачка´ ад першей жонкі за яё харошчая. Аднаго разу жонка караля падышла да люстра
[2]
і пытаецца: «Люстро, люстро! Чы харошая я?» — «Ты харошая, але твая пасербіца
[3]
яшчэ харошчая!» — адказало
[4]
люстро. Тая крулева казала лакею весці пасербіцу на спацыр,
[5]
там яё забіць і прынесці на тарэлцы серца. Лакей зараз павёў кралеўну на спацыр, сказаў ёй ўсё, што казала крулева, і намейсцо
[6]
каралеўны забіў сабаку, выняў сердца і палажыўшы на тарэлцу, аднёс да крулевай; а кралеўне сказаў, каб яна ішла, куды сабе хочэ.

2

Крулева вельмі была рада, што стра´ціла сваю пасербіцу, ад сабе харошчую; а кралеўна, разстаўшыся з лакеем, пашла туды, куды панясуць очы. Ідзе яна дак ідзе — аж у лесе стаіць палац,[7] аж там у ўсіх пакоях папрыбірано і нікога няма. Яна хадзіла па том палацы, хадзіла, аж прыязджаюць дванаццаць мужчын; а тые мужчыны былі дванаццаць братоў каралевічаў, каторые жылі ў летнім палацы. Хадзілі яны па ўсіх пакоях, аж у адном у самам астатнем знашлі панну. Разглядзеўшы яё, кажды з ней захацеў жаніцца; але як не маглі пагадзіцца, [8] то узялі яё сабе за сястру і вельмі уважалі,

3

Тая крулева была пэўная,[9] што пасербіцы няма; але аднаго раза, прэз цякавосць,[10] падышла да люстра і запыталася: «Люстро, люстро! Чы харошая я?» — «Ты харошая, але твая пасербіца яшчэ харошчая — у дванаццаці братоў каралевічаў». Крулева казала прывясці да сабе бабу-чараўніцу і, даўшы ёй многа грошэй, сказала: «Глядзі ты мне, кабы пасербіцы маёй ў тры дні не было!» — «Добра!» — сказала чараўніца, перабралася за крамарку
[11]
і пашла. Прыходзіць да таго палацу, гдзе жыла кралеўна, аж там нікога боле не застала — толькі адну кралеўну, сядзеўшую пад акном. Кралеўна, ўбачыўшы бабу, казала зараз яё да сабе прывесці і сгала разпытвацца: аткуль яна? «Я хаджу па свеце, каб што-небудзь зарабіць; я крамарка і маю да продання іголкі, шпількі, персцёнкі і другія тавары». — «Ну, пакажы!» — сказала кралеўна. Тая баба зачала паказваць персцёнкі, і кралеўна адзін упадабала,
[12]
заплаціла болей — колькі баба хацела, і адправіла яё. Доўго перабірала кралеўна той

персцёнак, а после ўлажыла на палец. Як ўлажыла, так зрабілася нежывою.

4

Папрыязджалі браты з палявання[13] і зараз пабеглі вітацца[14] з сястрою. Входзяць у яё пакой — аж яна ляжыць нежывая. Плакалі браты, плакалі, а после зачалі разбіраць, как улажыць другое адзене; [15]
толькі што яны зачалі разбіраць, аж адзін зняў персцёнак; як зняў персцёнак, дак кралеўна ажыла і, ўстаўшы, сказала: «Як я смачно спала!» — «Ты ня спала, але была нежывая; цябе нехта ачараваў», — сказалі брацця. «Гэта, мусібыць,
[16]
баба, ў каторай я купіла персцёнак, мяне ачаравала». Браты, на другі дзень выезджаючы, прыказалі, каб нікога да палацу не ўпушаць.

---

5

Крулева ізноў прышла да люстра пытацца, і тое таксамо адказало, што «ты харошая, а твая пасербіца яшчэ харошчая». Зараз паслала крулева па тую чараўніцу і прыказала ёй канечне страціць з свету пасербіцу. Тая баба перабралася за небарачку[17] і пашла да палацу, гдзе жыла кралеўна. Падышла пад акно кралеўны і стала гаварыць пацяры.
[18]
Кралеўна, пачуўшы, казала вынясці тры грошы і адправіць бабу. Лакей, каторы выносіў грошы бабе, быў ад яё загоджаны
[19]
і падняўся ваткнуць шпільку, каторую дала баба. Той лакей аднаго дня, вымятаючы, нібыто знашоў шпільку, панёс яё да кралеўны і аддаў. Кралеўна думала, што гэта шпілька яё, ўзяла — ўлажыла ў галаву´. Як толькі ўлажыла, дак і зрабілася нежывою. Браты, прыехаўшы, пашлі да яё пакою і там знашлі яё нежывую; зачалі разбіраць, і кралеўна не ажыла. Яны зрабілі для яё срэбную труну,
[20]
завязлі ў неякі лес і там павесілі на адном дзераве.

6

Крулева, ўбіраючыся, ізноў запыталася ў люстра: чы харошая яна? І люстро адказало, што «ты найхарошчая ў цэлым свеце». Крулева была вельмі рада, што няма нікога, хто бы за яё быў харошчы. Аднаго дня ў том лесе, гдзе вісела ў труне кралеўна, паляваў неякі кралевіч здалёка. Сабакі кралевіча, як загналіся за зайцамі, дак аж да той труны, гдзе вісела кралеўна. Кралевнч паляцеў конно[21] за сабакамі. Сабакі кінулі зайца і зачалі ўядаць [22] на дзераво ўго´ру,[23] гдзе вісела труна. Кралевіч, зазлаваўшыся
[24]
на сабак за тое, што кінулі зайца, паляцеў іх біць; але як пад’ехаў, дак бляск у вочы яму ўдарыў. Ён глянуў ўгору і ўбачыў срэбную труну; ён зараз паклікаў людзей і казаў тую

труну зняць, улажыць на воз[25] і вязці дадому, і там паставіць у яго пакоі — так, каб ніхто не бачыў. Людзі кралевіча зараз знялі труну, адвезлі дадому кралевіча і паставілі у яго пакоі.

7

На другі дзень і сам кралевіч прыехаў дадому, зараз прышоў да свайго пакою, адчыніу[26] труну і там убачыў вельмі харошую панну, і так у ней закахаўся,[27] што нікуды не выходзіў. Радзіцы[28] кралевіча самы не ведалі, што рабіць, што такі сын нудны[29] і ніяк не пушчае нікога да свайго пакою. Аднаго дня ён сядзеў у сваём пакоі, а после ўзяў зняў верх ад труны і зачау выбіраць шпількі з галавы і ўтыкаць у свой сурдут;[30] і як выняў адну шпільку, дак панна і ажыла. Ён зачаў яё абнімаць і зачаў разпытвацца, што з нею было? Яна расказала кралевічу аб усем і также яго палюбіла. Яны сідзелі ў сваём пакоі цэлы дзень, а назаўтра пашлі да радзіцаў, каб іх благаславілі. Прышоўшы туды, яны расказалі аб усем, і радзіцы вельмі былі рады, што сын развесяліўся, і іх паблагаславілі. У нядзелю[31] было вяселле,[32] а па вяселлі паехалі да бацька кралеўны. Прыехаўшы да бацька, дачка´ расказала аб усем: як яё мачаха хацела страціць з свету, як яна была у дванаццаці кралевічаў, а после як яё знашоў кралевіч і як яны пожаніліся. Бацька хацеў сваю жонку расцягнуць на жалезныя бороны, але дачка´ не пазволіла. Назаўтра быў бал, на каторым былі і тые дванаццаць кралевічаў; і я там быў, мёд-віно піў, па барадзе цякло, а ў роце не было.